**В. Л. Бруцкая,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
вышэйшай катэгорыі Белавушскай СШ Столінскага раёна

**Завочнае падарожжа «Край, дзе ты нарадзіўся»**

Выхаванне і навучанне сродкамі краязнаўства – шматгранны працэс, які садзейнічае пашырэнню кругагляду і развіццю пазнавальнага інтарэсу вучняў да беларускай гісторыі, культуры, сваіх каранёў. Практычна на кожным уроку беларускай мовы і літаратуры можна прымяняць краязнаўчы матэрыял. Найбольшая эфектыўнасць выкарыстання такога матэрыялу дасягаецца пры спалучэнні вучэбнай і пазакласнай работы. Дзякуючы такой інтэграцыі вучні шырока раскрываюць тэмы сачыненняў па мове, узбагачаюць лексічны запас, што дае магчымасць хутка падбіраць патрэбныя словы для выражэння сваіх думак.З вялікім жаданнем вучні прымаюць удзел у тыднях беларускай мовы, Днях роднай мовы, беларускіх вечарынах, а таксама ў інтэлектуальнай гульні «Буслік».

Не толькі актуальнасць краязнаўчай дзейнасці матывавала нас працаваць у гэтым напрамку, але перш за ўсё любоў да роднага краю, да сваёй вёскі, у якой нам даў Бог нарадзіцца і жыць да гэтага часу, любоў да прыроды, зносіны са знакамітымі землякамі, сустрэчы з паэтамі і пісьменнікамі Століншчыны. Падарожжы па малой радзіме і па ўсёй краіне разам са сваімі вучнямі падштурхнула больш сур’ёзна аднесціся да практычнага выкарыстання краязнаўчых ведаў на ўроках беларускай мовы і літаратуры.

Адлюстраванне краязнаўчай работы знаходзіць месца на старонках раённай газеты «Навіны Палесся», што падштурхоўвае вучняў да напісання нататак, артыкулаў, творчых справаздач аб падарожжах, экскурсіях і інш.

Таксама практыкуецца размяшчэнне матэрыялаў у інтэрнэце пад назваю «Падарожжа па родным краі» (https://vk.com/club154980900).

Запрашаем вас на завочнае падарожжа па малой радзіме — Століншчыне **«Край, дзе ты нарадзіўся»**.

**Мэта:** выхаванне ў вучняў павагі да малой радзімы, пачуцця гонару за свой аграгарадок і Столінскі раён.

**Задачы:**

фарміраваць пазнавальную актыўнасць вучняў шляхам выкарыстання краязнаўчага матэрыялу;

развіваць культуру вуснага маўлення вучняў;

спрыяць духоўнаму станаўленню асобы.

**Абсталяванне:** мультымедыйная прэзентацыя, стэнды «Знакамітыя землякі», «Паэты Століншчыны», выстава кніг паэтаў Століншчыны.

**Эпіграф:** «Люблю наш край, старонку гэту, дзе я нарадзілася, расла...». (Канстанцыя Буйло).

**Ход мерапрыемства**

**Настаўнік** (у нацыянальным адзенні): Палессе! Століншчына! Мая родная Белавуша! Люблю сваю вёску! З дзяцінства мяне цікавіць усё, чым жыве мая малая радзіма, а колькі яшчэ не ведаю! А колькі яшчэ таямніц хавае край, дзе ты нарадзіўся! Сёння мы з вамі паспрабуем здзейсніць сваё падарожжа па нашай малой радзіме і ўзбагаціць веды пра родны край.

**СТАНЦЫЯ «ЗНАКАМІТЫЯ ЗЕМЛЯКІ»**

Кожны вучань атрымаў дамашняе заданне сустрэцца з роднымі або знайсці інфармацыю і расказаць пра знакамітага земляка. І вось, што ў нас атрымалася.

**Вучань 1.** Павел Уладзіміравіч Калавур – Старшыня праўлення Нацыянальнага Банка Рэспублікі Беларусь.

Павел Калавур нарадзіўся і вырас у небагатай сялянскай сям'і ў вёсцы Белавуша Столінскага раёна. У жоўтым бацькоўскай доміку па вуліцы Леніна жыла яго мама, а непадалёк жывуць брат Леанід і сястра Ніна. Жыла сям'я сціпла, і ў бацькоў лішніх сродкаў на тое, каб адправіць дзіця вучыцца, не было. Ды і ў тыя часы адправіць "лішнія рукі" далей ад дома было недазваляльнай раскошай. Пасля 8 класаў школы Павел паступіў у Пінскі ўлікова-крэдытны тэхнікум (цяпер Палескі дзяржаўны універсітэт) [2].

Зараз у школе ўжо не засталося тых, хто вучыў Паўла. Маладыя выкладчыкі пра вядомага выпускніку ведаюць па расказах сваіх прымудроных сівізной калег, якія ўсё яшчэ жывуць у Белавушы. Марыя Мікалаеўна Грышко адна з іх. У мінулым яна чатыры гады выкладала Паўлу беларускую мову і літаратуру. Аб сваім вучні ўспамінае з цеплынёй і ўсмешкай. Прызнаецца, што хлопчык быў старанны, руплівы і педантычны. Нягледзячы на цягу да дакладных навук, родную мову паважаў: "Не ведаю, як зараз, а ў школе Паўлуша ведаў беларускую на выдатна".

Былы настаўнік гісторыі Фёдар Якаўлевіч Бурван зараз жыве ў Пінску. Нават на пенсіі ён працягвае пільна сачыць за лёсамі сваіх вучняў. Як успамінае настаўнік, лепш за ўсё Паўлу даваліся дакладныя навукі. "Ён, як і яго бацька, быў развіты не па гадах. Нічога лішняга ніколі не казаў, быў руплівым, здольным, з матэматычным складам розуму. Бацькі ў яго былі вельмі гаспадарчымі, працавітымі, разважлівымі".

У вольны ад вучобы і працы час Павел, па словах аднакласнікаў, любіў чытаць апавяданні пра Шэрлака Холмса.

**Вучань 2.** Ігар Уладзіміравіч Луцкі – Генеральны дырэктар тэлеканала СТБ.

Дзяцінства правёў у вёсцы. Вольны час баяў у калгасным гаражы, дзе бацька быў галоўным інжынерам. Ды і першы запіс у працоўнай кніжцы – трактарыст калгаса «Перамога» (працаваў у час летніх канікул, калі быў ужо студэнтам).

Вучыцца любіў. Шмат чытаў. Бацькі купілі дзецям Ігару і Уладзіміру поўны камплект літаратурных твораў па школьнай праграме, які захаваўся да нашага часу, і ім ужо карыстаюцца дочкі.

Цудоўна валодае беларускай мовай. З усмешкай успамінае, як уразіў прыёмную камісію інстытута, калі адказваў білет па фізіцы па-беларуску.

У яго кар’ернай лесвіцы шмат прыступак: адміністрацыя прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, БелТА (намеснік Генеральнага дырэктара), Міністрэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь (першы намеснік міністра) і іншыя. Але нягледзячы на такія высокія пасады, дадому прыязджае проста сын, ветлівы, клапатлівы, памочнік маці па гаспадарцы, яе гонар і радасць.

**Вучань 3.** Пётр Уладзіміравіч Піліпчук, протаіерэй Ганцавіцкага раёна. Рыгор Уладзіміравіч Піліпчук, благачынны цэркваў Івацэвіцкага раёна.

Сям’я Піліпчукоў была шматдзетнай. У вялікай прасторнай хаце, што стаяла ў цэнтры вёскі Белавуша Столінскага раёна, гадаваліся два хлопчыкі і чатыры дзяўчынкі. Нягледзячы на тое, што бацькам, Уладзіміру Адамавічу і Сцепанідзе Паўлаўне, даводзілася працаваць многа і цяжка, паход у царкву быў справай святой. Акрамя таго, маці спявала на клірасе і не прапускала без прычыны аніводнай службы. Да гэтага прывучала і ўсіх сваіх сямейнікаў, асабліва старэйшых дзяўчынак. Калі малодшанькаму, гарэзліваму і яснавокаму хлапчуку Пятру, не надта хацелася ісці ў храм, яго старэйшая сястра Марыя брала за руку і казала: «Ідзём усе! Мы – адна сям’я, і царква – наш дом!» [4].

Не змарнаваныя на пустое, прайшлі-праляцелі гады. Пабудаваў храм у Івацэвічах, у гэтым жа раёне ўзнавіў да жыцця больш за дзесяць духоўных святынь раёна брат Рыгор, благачынны цэркваў Івацэвіцкай акругі. Дваццаць тры гады служыць Царкве і людзям зямлі Ганцавіцкай протаіерэй Пётр Піліпчук, аддана, шчыра, свята верачы, што «Богу трэба аддаваць усё самае лепшае».

**Вучні расказваюць пра знакамітых землякоў:**

Уладзімір Адамавіч Сенькавец – кандыдат філалагічных навук. Дацэнт. Працуе ў Брэсцкім дзяржаўным універсітэце імя А.С. Пушкіна.

Надзея Мікалаеўна Палукошка – намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце. Працуе ў Фядорскай сярэдняй школе Столінскага раёна.

Лявонцій Іванавіч Вабішчэвіч – кандыдат тэхнічных навук. Дацэнт. Працуе ў Брэсцкім дзяржаўным тэхнічным універсітэце.

Віктар Іванавіч Пашкевіч – доктар медыцынскіх навук, Заслужаны ўрач Расійскай Федэрацыі.

Анатолій Пятровіч Бараноўскі – начальнік фінансава-эканамічнага аддзела Магілёўскага абласнога упраўлення МЧС.

Сняжана Фёдараўна Бурван – ганаровы настаўнік Ленінградскай вобласці, Выдатнік адукацыі Расійскай Федэрацыі, двойчы пераможца прыярытэтнага праекта «Адукацыя» пры прэзідэнце РФ.

**Настаўнік:** Дзякуй! Усе добра падрыхтаваліся. А мне застаецца толькі сказаць: «Няхай праслаўляюць наш край землякі!», а вы бярыце з іх прыклад, добра вучыцеся, каб і вамі маглі ганарыцца аднавяскоўцы.

**СТАНЦЫЯ «ЭКСКУРСІІ ПА СТОЛІНШЧЫНЕ»**

З вучнямі папярэдне былі праведзены экскурсіі па Столінскаму раёну.

**Настаўнік:** Люблю сваю радзіму. Люблю свой Столінскі край. І гэтую любоў стараюся прывіваць вучням. Гурткі «Літаратурнае краязнаўства» і «Падарожжа па малой радзіме» дзеці наведваюць з задавальненнем. Калі паедзем на экскурсію? Здзівіцеся, але ж гэта так. Альпень, Альманы, Фядоры,

Давыд-Гарадок, Плотніца, Цераблічы, Гарадная і многія другія мясціны Століншчыны былі наведаны вучнямі школы за апошнія два гады. Давайце падзелімся вашымі ўспамінамі і ўражаннямі. Што вам запомнілася пасля падарожжа ў аграгарадкі і вёскі?

**Вучань 1:** І вось мы ў Фядорах. Прыгажосць сучаснага аграгарадка можна ўбачыць толькі тады, калі ты туды трапіш. У цэнтры клуб, школа, садок...

Прыемна было паслухаць мастацкага кіраўніка Гунько Святлану Рыгораўну. Яна расказала пра гісторыю вёскі, пра яе абаронцаў, пра ўсім вядомы музей баявой славы. А экспанаты толькі дапоўнілі яе выступленне.

Не менш прыемнай была сустрэча з Надзеяй Мікалаеўнай Палукошка, якая запрасіла нас у школу, правяла экскурсію, з вялікім замілаваннем успомніла Белавушскую сярэднюю школу, якую скончыла. Не было лішнім дзецям пачуць і пра яе пераможцаў прадметных алімпіяд на рэспубліканскім узроўні, дзе Цярлецкая Вікторыя ў 2018 годзе атрымала дыплом І ступені па беларускай мове і літаратуры.

А каб экскурсія пра Фядоры была больш запамінальнай, яна дамовілася з загадчыкам комплекса Глебка Юрыем Міхайлавічам аб сустрэчы. І вось мы трапілі на адзін з буйнейшых у рэспубліцы жывёлагадоўчых комплексаў. За кароткі прамежак часу дзеці ўбачылі навейшую тэхніку, сустрэліся з пераможцамі гаспадаркі і наведалі памяшканні, дзе вырошчваюць быкоў.

Усё гэта цалкам адлюстроўвае жыццё аграгарадка Фядоры.

**Настаўнік:** Не забываецца аповед бабулі пра тое, як сагналі ў царкву і хацелі спаліць усіх жыхароў за аднаго толькі немца, які ўзарваўся на міне за вёскаю. Вайна. Жорстка здзекваліся фашысты. Не было для іх ні дзяцей, ні старых. Усё гэта пакінула вялікі адбітак у памяці тагачаснага народа. Мы з вамі наведалі помнікі загінуўшым воінам і ўпэўніліся ў тым, што ні адну сям’ю не абмінула гітлераўская навала. А ў Фядорах аб гэтым сведчаць Музей Баявой славы. Нельга паверыць, што і на тэрыторыі нашага раёна жорстка расправіліся немцы з людзьмі. Хто адкажа, у якой вёсцы, якую мы наведалі на экскурсіі, фашысты спалілі людзей у хляве? Яе яшчэ называюць у нашым раёне Сястра Хатыні.

**Вучань 2:** Жыхароў вёскі Варані ў гады Вялікай Айчыннай вайны (15.02.1943) спалілі ў хляве. Вёска Варані размешчана паблізу вялікіх лясоў, дзе знаходзілася партызанская зона. Вяскоўцы аказвалі магчымую дапамогу партызанам, былі іх сувязнымі, самі станавіліся партызанамі. Вось таму фашысты і вырашылі расправіцца з жыхарамі Воранаў. Удзячныя нашчадкі на месцах трагедый ўсталявалі абеліск і гранітную стэлу, а каля школы – помнік загінуўшым у барацьбе з фашысцка-нямецкімі захопнікамі аднавяскоўцам [1].

Вялікі куст каліны, пасаджаны каля помніка не выпадкова, ён напамінае пра горыч на душах сваякоў і аднавяскоўцаў за загубленыя жыцці.

**Настаўнік:** У нашай школе існуе літаратурна-краязнаўчы куток. А якую вёску мы наведалі, дзе створаны музей з краязнаўчымі экспанатамі?

**Вучань 3:** Наведалі краязнаўчы музей у вёсцы Альпень. Кіраўнік музея Іван Ляшкевіч распавёў пра арганізацыю музея, сабраных экспанатах, праведзеных экскурсіях, зацікаўленых людзях, сучасным і будучым музея.

Хлопцы ўбачылі жорна, свойцы, кудзелю і шмат іншых экспанатаў. А экскурсавод музея Ляшкевіч І.В. пракаментаваў сустрэчу з вучнямі школы такімі словамі: "Сёння днём вучні вашай школы з класнымі кіраўнікамі пабывалі ў нашым музеі. Вельмі спадабалася група! Дзеці выхаваныя, дапытлівыя. І вельмі ім спадабаліся жорна, якія молюць збожжа на муку. Амаль усе паспрабавалі малоць! Бо яны ў нас рабочыя ... "

**Настаўнік:** У аграгарадку Белавуша людзі вырошчваюць агуркі на продаж. А ў якой вёсцы людзі збіраюць на балоце ягады?

**Вучань 4:** У вёсцы Альманы збіраюць журавіну балотную і праводзіцца журавінны фестываль. У 2018 годзе свята атрымала статус міжнароднага – у ім удзельнічаюць дэлегацыі з Украіны і Польшчы.

Таксама вёска Альманы размяшчаецца каля рэспубліканскага ландшафтнага заказніка «Альманскія балоты», які з'яўляецца найбуйнейшым у Еўропе комплексам верхавых, пераходных і нізінных балот. У мясцовасці існуе глабальная праблема захавання Альманскіх балот і аховы журавіны дробнаплоднай, якая занесена ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь і расце разам з журавінай балотнай. Таму і пакутуе: вытоптваюць яе падчас масавага збору ягад.

**Настаўнік:** У якой вёсцы ёсць музей ганчара, а людзі ўжо паўтысячы гадоў жывуць на гліне?

**Вучань 5:** Музей-сядзіба ганчара размяшчаецца ў в. Гарадная у звычайным сялянскім доме, дзе кожны наведвальнік зможа ўбачыць, як у даўніну жыў і працаваў Гараднянскі глінамес. Традыцыі вырабу гаршкоў і Куўшынаў захаваліся з часоў Вялікага княства Літоўскага. Разам з традыцыямі ганчарнага промыслу ў Гараднной сфарміравалася ўласная метрычная сістэма. Пудовы гаршчок – на 16 кілаграмаў збожжа – тут называюць "паляк". Ну, а маленькі – на кілаграм – у народзе клічуць «мамзелька».

**Настаўнік:** У якой вёсцы працуе скульптар па дрэве?

**Вучань 6:** Скульптар Іван Супрунчык стварае гісторыю родных Цераблiч. Гэтая вёсачка ў Столінскім раёне – самая глыбінка Беларускага Палесся. Іван захапіўся драўлянай скульптурай і этнаграфіяй. Цэнтр драўлянай скульптуры – гэта звычайная вясковая хата. Так было задумана першапачаткова. З парога гасцей сустракаюць мясцовыя "жыхары". Усім ім ужо больш за тысячу гадоў. Гэта родапачынальнікі Цераблiцкага прозвішчаў. Легенда пра тое, як кожны з родаў атрымаў мянушку, дайшла і да цяперашняга пакалення, а Іван Супрунчык матэрыялізаваў яе ў статуях. Так пад адным дахам ўжыліся статуі-легенды, высечаныя выключна сякерай, і артэфакты, якімі цікавяцца навукоўцы [3].

А вось свет канца XX і пачатку цяперашняга стагоддзя Іван Супрунчык адлюстроўвае не толькі ў скульптурах, але і карцінах. У іх – разважанні пра вечныя каштоўнасці, барацьбе дабра і зла, сучасных праблемах. На адной з карцін падарожнік выбірае шлях паміж чорным і чырвоным квадратамі. На другой – пажылы селянін схіліўся над птушанём бусла, выкінутым з гнязда. Іван Супрунчык упэўнены, гэты стары разважае як раз пра тое, што сёння чалавецтва губляе: пашана да продкаў, любоў да сваёй Радзімы.

**СТАНЦЫЯ «ЛІТАРАТУРНАЯ СТОЛІНШЧЫНА»**

**Настаўнік:** Колькі складзена песень пра цудоўны палескі край! Колькі напісана вершаў! І як не расказаць пра Віктара Вабішчэвіча, Галіну Бабарыка, Ірыну Ляшкевіч... У ходзе экскурсій мы сустракаліся з вядомымі паэтамі, якія жывуць і працуюць на Століншчыне. Пра іх творчасць вы ведаеце з іх вуснаў.

Давыд-Гарадок славіцца не толькі фестывалем «Конікі» – візітнай карткай горада. А яшчэ сваімі паэтамі і пісьменнікамі.

**Вучань 1:** Сустрэча з Віктарам Вабішчэвічам прайшла як адно імгненне. Гэтага чалавека Бог надзяліў вялікім талентам. Ён летуценнік. Ён па-свойму бачыць свет і з вялікім захапленнем і любоўю расказвае пра дзяцінства, пра сваё жыццё і жыццё тых, хто яго акружае. Было прыемна чуць, што Віктар Вабішчэвіч добра ведае «балагушскую» зямлю, што ён яе не толькі праязджае аўтобусам, але ж і абкалясіў на веласіпедзе, і пехатою любіць прайсціся з Белавушы ў Рубель. А з якой шчырасцю гучалі словы пра маці!

Мабыць, не кожнаму пашчасціць паслухаць вершы з вуснаў самога паэта. Мы ўдзячны за аповед пра Столінскую зямлю, за абгрунтаваны аналіз і прэзентацыю аўтарскіх кніг «ORBI» і «Уражанне».




**Паэт Віктар Вабішчэвіч з вучнямі Белавушская сярэдняй школы**

**Настаўнік:** У вёсцы Мачуль працуюць дзве паэтэссы – Галіна Бабарыка і Ірына Ляшкевіч. Мы наладзілі з імі сустрэчы: то мы з’ездзім да іх, то яны прыедуць да нас. Давайце успомнім нашу першую сустрэчу з Г.С. Бабарыка.

**Вучань 2:** Вёска Мачуль знаходзіцца далёка ад раённага цэнтра, але ж шасэйная дарога прывяла хутка да Мачульскай школы. Расчыніліся дзверы і нас сустрэла Галіна Сідараўна Бабарыка. Нельга было паверыць, што перад намі звычайная сельская настаўніца, якая мае адгалоскі не толькі ў Беларусі, але і далёка за яе межамі. Яна чалавек чулай душы, заўважае ўсё да драбніц: і як працуюць аднавяскоўцы, і змены пораў года, і адлёт буслоў, і развітальны крык жуpавоў...

Яе хвалюе лёс родных ёй людзей, не застаюцца без увагі землякі, адным словам усе падзеі з жыцця маюць адбітак у творах Галіны Бабарыка. Прыемна было пачуць, што паэтэса добра ведае выхадца з Белавушы – Уладзіміра Адамавіча Сенькаўца, які працуе ў Брэстскім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя А.С. Пушкіна, і што зусім нядаўна наведвала Белавушскую Свята-Троіцкую царкву.

З вуснаў паэтэсы даведаліся, чаму называецца зборнік вершаў «Дарога ў восень». Запомніліся вучням прачытаныя самім аўтарам гумарыстычныя аповеды і вершы.

Мы ўдзячны за сустрэчу. Жадаем у далейшым плённай працы.

**Настаўнік:** У нашым літаратурна-краязнаўчым кутку ёсць стэнд «Паэты Століншчыны», дзе адлюстравана творчасць выхадцаў са Столінскага раёна – Уладзіміра Глушакова, Алеся Наварыча, Георгія Марчука, Леаніда Дранько-Майсюка. Прапаную вам віктарыну па жыцці і творчасці паэтаў і пісьменнікаў Століншчыны.

*Пытанні і адказы:*

*1. Хто нарадзіўся ў вёсцы Рубель, працуе ў іншым месцы, стварыў зборнік вершаў «Кахаю і люблю»? (Віктар Васільевіч Вабішчэвіч, працуе ў СШ № 2 Давыд-Гарадка)*

*2. Мы сустракаліся з сааўтарам калектыўнага зборніка «Літаўра». Назавіце месца і прозвішча аўтара. (Мачуль, Галіна Сідараўна Бабарыка)*

*3. У школьнай бібліятэцы ёсць кніга «Пра тое як я», якая мае яшчэ назву «13 несур'ёных апавяданняў». Назавіце аўтара і месца, адкуль ён родам. (Леанід Дранько-Майсюк, Давыд-Гарадок)*

*4. Які паэт, з якім мы сустракаліся, уваходзіць у рэдакцыйны склад часопіса «Роднае слова»? (Віктар Васільевіч Вабішчэвіч)*

*5. Назавіце аўтара сцэнарыя да фільма «Кветкі правінцыі», а яшчэ ён стварае выдатныя казуі для дзяцей, якія ёсць у нашай школьнай бібліятэцы. (Георгій Марчук)*

*6. У якім месцы Століншчыны нарадзіўся аўтар гістарычнага рамана «Літоўскі воўк», таксама назавіче яго прозвішча. (Відзібор, Алесь Наварыч)*

*7. Мы сустракаліся з аўтарам вершаў «Сувой». Назавіце месца і прозвішча аўтара. (Мачуль, Ірына Ляшкевіч)*

*8. Назавіце выхадца з Давыд-Гарадка, які стварыў зборнік прозы «Развітанне на пачатку вясны». (Уладзімір Глушакоў)*

*9. З якімі паэтамі мы сустракаліся, якія працуюць у адной вёсцы? (Ірына Ляшкевіч і Галіна Бабарыка, вёска Мачуль)*

*10. Ці пералічыце вы трох або чатырох паэтаў і пісьменнікаў, імёны якіх звязаны з Давыд-Гарадком? (Нарадзіліся ў Давыд-Карадку Уладзімір Глушакоў, Георгій Марчук і Леанід Дранько-Майсюк, а яшчэ працуе ў Давыд-Гарадку Віктар Вабішчэвіч)*

**СТАНЦЫЯ «МОЙ РОД. МАЯ СЯМ'Я»**

**Настаўнік:** Кожны з вас падрыхтаваў сваё радаводнае дрэва. А зараз напішыце кожны назву свайго роду і прычапіце лісцік на дошцы. Паспрабуем размеркаваць роды ў алфавітным парадку ( - ваш бацька; - ваша маці; - ваша бабуля; - ваша суседка; - ваш сябар).

Зараз мы з вамі паглядзім, што ў вас атрымалася. Мой род: ШАМАЙЛЫ; КУЛАКІ; ПЕЦІКІ; СВАЦІКІ; РЫСКІ; СОРОКІ; ПАТАНЫ; ВУШЭЛЕ; ЧАБАКІ; ЖЫДЗЮКІ; НОВІКІ; ПАЧКІ; ГУРЭ; ЛАЦУНЫ; КАЙТАНЫ; ГОСТРЫЕ...

А цяпер паспрабуйце агучыць адкуль пайшла назва вашага роду.

**Рэфлексія зместа матэрыялу мерапрыемства**

Прыём «Няскончаная прапанова»: Я не ведаў ... – цяпер я ведаю ...

**Літаратура**

1. **Базар, Наталья.** Трагедии в истории деревни Ворони [Электронны рэсурс] / Медиа-Полесье. – Рэжым доступу: https://media-polesye.by/news/tragedii-v-istorii-derevni-voroni-20905. Дата доступу: 18.02.2019.

2. **Коршунов, Станислав.** «Мать молилась, чтобы он не поступил». Как простой парень из белорусской глубинки стал главным банкиром страны [Электронны рэсурс] / Беларускі партал FINANCE.TUT.BY. – Рэжым доступу: https://finance.tut.by/news441916.html. – Дата доступу: 15.11.2018.

3. Митюков, Александр. Тонкая топорная работа [Электронны рэсурс] / СБ: Беларусь сегодня. – Рэжым доступу: https://www.sb.by/articles/tonkaya-topornaya-rabota.html. Дата доступу: 10.12.2018.

4. **Пупач, Галіна.** «Міру ўсім!», або Пра тое, як жыць з любоўю і верай [Электронны рэсурс] / Савецкае Палессе. – Рэжым доступу: http://www.gants.by/duchoynasc/39784.html. – Дата доступу: 18.02.2019.